АДДЗЯЛЕННЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ
ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
**ЗАПРАШАЕ**
**прыняць удзел у**
**Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі**
**ВЫНІКІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**
**НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 2012 ГОДЗЕ**

**Асноўныя напрамкі працы канферэнцыі:**

1. Археалагічныя даследаванні помнікаў першабытнай эпохі;
2. Археалагічныя даследаванні помнікаў сярэдневякоўя;
3. Археалагічныя даследаванні помнікаў культавай і абарончай архітэктуры;
4. Ахоўныя мерапрыемствы ў зонах новабудоўляў і інвентарызацыя помнікаў археалогіі.

***Тэрмін правядзення канферэнцыі:*** 16–17 мая 2013 г.
***Месца правядзення канферэнцыі:*** ДНУ «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі».
**Рэгламент:** выступленні на пленарным пасяджэнні да 20 хвілін, на секцыях – да 15 хвілін.
**Працоўныя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская.

**Тэрмін падачы заяўкі ў аргкамітэт:** да 1 красавіка 2013 г.
У заяўцы на ўдзел у канферэнцыі паведамляецца назва даклада, прозвішча, імя, імя па бацьку, вучоная ступень, званне, месца працы, працоўны тэлефон, хатні адрас, хатні тэлефон, e-mail.

Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваныя. Электронны варыянт артыкула памерам да 0,5 д.а. разам з ілюстрацыямі (тэкст не больш 20 тыс. знакаў, рэзюмэ на рускай, беларускай і англійскай мовах, ілюстрацыі, падрыхтаваныя ў фармаце tif, якасць 600 dpi) і яго раздрукаваны варыянт перадаюцца ў аргкамітэт у дзень пачатку канферэнцыі 16 мая 2013 г. Літаратура прыводзіцца ў канцы артыкула. Спіс літаратуры павінен быць складзены ў парадку з'яўлення спасылак у тэксце, якія змяшчаюцца ў квадратныя дужкі, напрыклад: [1, с. 12], ці [1]. Афармленне літаратуры згодна патрабаванням ВАК Рэспублікі Беларусь.

Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для удзелу ў канферэнцыі і артыкулаў для публікавання.

Аплата праезду, харчаванне і пражыванне за кошт камандзіруючых арганізацый.

***Кантакты:*** 220072 г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Цэнтр гісторыі даіндустрыяльнага грамадства. Ляўко В.М. – (017) 284-28-54,levko@mail.by; Пашык А.В. – (017) 284-28-54, pashik69@mail.by; Лакіза В.Л. – (017) 284-13-22, lakvadim@yandex.ru. Факс: (017) 284-18-70